МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

ПРАВОВАЯ ИНИЦИАТИВА

# Фрунзенскі РУУС г.Мінска. Катаванні затрыманых у жніўні 2020 года

Грамадскае расследаванне




© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2022

# Змест


**Коратка пра тое, што адбывалася ў Фрунзенскім РУУС** ..... 4

**Метадалогія расследавання** ..... 7

**Храналогія катаванняў** ..... 8

**9-13 жніўня 2020 года** ..... 8

**9 жніўня 2020 года** ..... 8
21.00-24.00 ..... 8

**10 жніўня 2020 года** ..... 8
00.00-04.00 ..... 8
04.00-08.00 ..... 9
16.00-20.00 ..... 9

20.00-24.00 ..... 10

**11 жніўня 2020 года** ..... 11
00.00-04.00 ..... 11
04.00-10.00 ..... 14
11.30 - 16.00 ..... 15
16.00 - 20.00 ..... 16
21.00 - 23.00 ..... 16
00.00 ..... 20

**12 жніўня 2020 года** ..... 20
00.00-04.00 ..... 20
04.00-08.00 ..... 22
08.00-12.00 ..... 23
16.00-20.00 ..... 23
20.00-24.00 ..... 23

**13 жніўня 2020 года** ..... 24
00.00-04.00 ..... 24

**Наступствы катаванняў** ..... 25
Сексуальны гвалт ..... 26

**Службовыя асобы Фрунзенскага РУУС г. Мінска, меркавана датычныя да здзяйснення злачынных дзеянняў** ..... 28

**Кваліфікацыя дзеянняў супрацоўнікаў Фрунзенскага РУУС г. Мінска і каральнасць** ..... 42

## КОРАТКА ПРА ТОЕ, ШТО АДБЫВАЛАСЯ Ў ФРУНЗЕНСКІМ РУУС

Фальсіфікацыі выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года прывялі да масавых пратэстаў беларускіх грамадзянаў. Грамадзяне сутыкнуліся з небывалай жорсткасцю сілавікоў падчас затрыманняў, жорсткім збіццём падчас перавозак. Месцы часовага ўтрымання затрыманых (раённыя ўправы ўнутраных спраў) ператварыліся ў месцы масавых здзекаў, збіцця і катаванняў.

Адным з самых жорсткіх месцаў утрымання стала Фрунзенская ўправа ўнутраных спраў горада Мінска, у якой з самага пачатку заглушэння пратэстаў жорстка абыходзіліся і катавалі сотні беларускіх грамадзянаў, а таксама грамадзянаў іншых дзяржаваў (Польшчы, Расіі і іншых).

9-13 жніўня 2020 года ў Фрунзенскі РУУС г. Мінска пастаянна дастаўляліся затрыманыя ў горадзе грамадзяне. Сярод затрыманых былі розныя людзі: маладыя, пажылыя, тыя, хто выходзілі на мітынгі свядома, і нават выпадковыя мінакі, таксама сярод затрыманых былі журналісты, у тым ліку замежныя.

Усіх затрыманых першапачаткова праганялі праз супрацоўнікаў АМАПу, якія стаялі па абодва бакі і наносілі ім удары дубінкамі. Прывезеныя асобы ўтрымліваліся ў асноўным у спартовай зале (невялікая частка - у не-

калькіх перапоўненых камерах РУУС, ціры і ў боксе-гаражы).

Большую частку часу знаходжання ў спартовай зале і гаражы рукі затрыманых былі ў наручніках ці сцяжках, якія туга зацягваліся. Некаторых з затрыманых пазначалі фарбай. Гэта азначала, што дадзенага затрыманага неабходна збіваць з асаблівай жорсткасцю. Затрыманыя траплялі пад жорсткае збіццё, абразы. Збіццё адбывалася дубінкамі, нагамі, рукамі; прымяняўся электрашокер. Многія затрыманыя мелі сляды збіцця ў вобласці твару і галавы, ног, ягадзіцаў, паясніцы.

У памяшканнях РУУС на падлозе, сценах былі сляды крыві, мачы. Акрываўленыя людзі ляжалі са звязанымі за спінай рукамі на падлозе ці стаялі на каленях. Як распавядаюць сведкі, некалькі чалавек, якія не падавалі прыкметаў жыцця, вынеслі са спартовай залы. Іх звезла хуткая дапамога.

Затрыманых прымушалі крычаць: «Мы любім Беларусь, усе мы любім нашага прэзідэнта Лукашэнку, мы не будзем больш граміць горад. Мы любім АМАП» і г.д. Тых, хто замарудзіўся ці маўчаў, шалёна білі.

У прыбіральню на працягу ночы затрыманых не выводзілі. За ўвесь час знаходжання ў міліцыі іх не кармілі, часта адмаўлялі ў піцці. Асабістыя рэчы дастаўленых у аддзел міліцыі - сотавыя тэлефоны - разбіваліся. Час ад часу кожнага з затрыманых выводзілі са спартовай залы ў іншыя кабінеты для складання вопісу рэчаў, падпісання пратаколаў, здымкі на камеру і проста для збіцця. Ад некаторых затрыманых патрабавалі падпісаць пустыя аркушы паперы. Пры спробе прачытаць складзеныя ў дачыненні да іх пратаколы грамадзянаў зноў збівалі.

Тым, хто выходзілі на мітынгі свядома і не хавалі гэтага, у віну ставілі арт. 23.34 [1] (Парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў), выпадковым людзям - арт. 17.1. (Дробнае хуліганства) КаАП Рэспублікі Беларусь.

Калі затрыманых выводзілі з будынка Фрунзенскага РУУС у аўтазак, іх зноў праганялі праз калідор з міліцыі і АМАПаўцаў і збівалі дубінкамі і нагамі.

У выніку шматлікага збіцця пры затрыманні, перавозцы і знаходжанні ў РУУС, псіхалагічнага стрэсу многім з затрыманых была неабходная медыцынская дапамога. Людзі прасілі нашатыр, лекі, у многіх былі пашкоджаныя звязкі, косткі на руках і нагах. На просьбы выклікаць лекара ніякай

1 Пасля ўнясення зменаў у КаАП Рэспублікі Беларусь арт. 24.23.

рэакцыі не было. **Медыцынская дапамога затрыманым у памяшканнях РУУС не надавалася.**

Па апісаннях пацярпелых можна меркаваць, што пад прыніжальную і жорсткую працэдуру ўтрымання ў Фрунзенскім РУУС г.Мінска ў гэты перыяд часу трапілі прыблізна **ад 400 да 600 грамадзянаў**.

Як паказала дадзенае расследаванне, у катаваннях і збіцці грамадзянаў 9-13 жніўня 2020 года ў памяшканнях Фрунзенскага РУУС г. Мінска ўдзельнічалі не толькі супрацоўнікі дадзенага РУУС, але і супрацоўнікі з іншых падраздзелаў і сілавых структураў Беларусі.

# МЕТАДАЛОГІЯ РАССЛЕДАВАННЯ

Злачынствы супраць чалавечнасці не маюць тэрмінаў даўніны. Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі больш за паўтара гады праводзіць збор інфармацыі пра факты такіх злачынстваў з розных крыніцаў. Экспертамі праводзіцца пошук і апрацоўка сведчанняў пацярпелых, аналізуецца інфармацыя з адкрытых крыніцаў, дакументы, дадзеныя грамадзянскімі ініцыятывамі і грамадзянамі.

У дадзеным расследаванні вывучаныя, старанна прааналізаваныя і абагульненыя інтэрв'ю з пацярпелымі ў перыяд з 9 да 13 жніўня 2020 года ў будынку Фрунзенскага РУУС г.Мінска. Такім чынам былі апрацаваныя сведчанні 58 пацярпелых.

Прапаноўваецца храналогія таго, што адбывалася ў памяшканнях Фрунзенскага РУУС г.Мінска ў перыяд з 9 да 13 жніўня 2020 года. Асаблівая ўвага нададзеная злачынным дзеянням асобных супрацоўнікаў, якія трапляюць пад катэгорыі катаванняў; грамадзяне апісваюць дадзеных супрацоўнікаў. Нягледзячы на тое, што большасць сілавікоў хавала свае твары пад маскамі і балаклавамі, многіх з іх пацярпелыя змаглі ідэнтыфікаваць. У мэтах бяспекі сведкаў, іх дадзеныя не разгалошваюцца.

У расследаванні дадзеная юрыдычная кваліфікацыя дзеянняў і падрабязны пералік адказных за злачынствы асобаў.

# ХРАНАЛОГІЯ КАТАВАННЯЎ
# 9-13 ЖНІЎНЯ 2020 ГОДА

## 9 жніўня 2020 года

### 21.00-24.00

Сведкі адзначаюць, што затрыманыя на выбарчых участках і вуліцах Мінска грамадзяне сталі масава дастаўляцца ў Фрунзенскі РУУС ужо ўвечары 9.08.2020 г. На выхадзе з аўтазакаў з супрацоўнікаў МУС былі выбудаваныя т.з. «жывыя калідоры», праходзячы праз якія затрыманыя былі збітыя. Далей збіццё працягвалася ў памяшканні РУУС, а потым практычна ўсе затрыманыя размяшчаліся ў спартовай зале.

## 10 жніўня 2020 года

### 00.00-04.00

Людзей у спартовую залу дастаўлялі ўсю ноч. Са словаў сведкаў, пасля поўначы іх там скапілася больш за 100 чал., усе яны ляжалі на падлозе. Людзей жорстка збівалі; збіццё суправаджалася здзекамі. Хлопцаў з доўгімі валасамі абстрыгалі, зразалі дрэды. У дачыненні да невядомага




мужчыны, які не хацеў размаўляць з супрацоўнікамі МУС, ужывалася катаванне: яго пры дапамозе наручнікаў падвешвалі на швабру. Пры дапамозе пагрозаў і гвалту прымушалі падпісваць сфальсіфікаваныя пратаколы. (**Сведка С., Сведка М.**)[1]

## 04.00-08.00

Утрымліваліся затрыманыя і ў кабінетах РУУС. **Сведка С**. адзначае, што ў кабінеце разам з ім знаходзілася 8 чал., усе яны ляжалі на падлозе і сілавікі прама па іх хадзілі. Жанчына-следчая патрабавала падпісваць пустыя аркушы паперы, пры адмове падпісаць людзей збівалі.

## 16.00-20.00

Дастаўленых людзей з аўтазакаў па адным літаральна выкідвалі ў двор РУУС, дзе стаялі людзі ў чорным; падымаць галаву забаранялася. Праз дзверы іх заганялі ў падвал, дзе супрацоўнікі ў чорным білі тых, хто бег, дубінкамі, а адтуль - у спартовую залу. У спартовай зале знаходзіліся супрацоўнікі МУС, некаторыя з іх былі ў форме і сядзелі за сталамі, усе ў масках. У зале знаходзілася каля 20 чал., але людзей прывозілі пастаянна, і хутка іх было ўжо чалавек 40.

1 Тут і далей прозвішчы пацярпелых замененыя літарамі, для кожнага прозвішча новая літара.

Са словаў **Сведкі В.**, яму загадалі ляжаць уздоўж сцяны на жываце, апусціўшы галаву ўніз, рукі былі звязаныя сцяжкай. За спробу падняць галаву атрымаў удар па шыі. Потым сведку паднялі і падвялі да стала, дзе пыталіся ПІБ, дату нараджэння, сямейнае становішча, фатаграфавалі, удакладнялі, дзе быў і чым займаўся на момант затрымання, навошта выйшаў на вуліцу. Прапанавалі падпісаць пратакол, змест якога не адпавядаў рэчаіснасці, аднак сведка яго падпісаў пад пагрозай збіцця. Кожнаму чалавеку прысвойвалі нумар. Такую працэдуру праходзілі ўсе.

Асабліва жорстка ставіліся да затрыманых, у якіх знайшлі нешта, што лёгка ўзгараецца, а таксама да замежнікаў, якіх супрацоўнікі называлі «лялькаводамі».

Не было літасці і да асобаў, у якіх знайшлі гістарычную нацыянальную сімволіку бела-чырвона-белыя сцягі, выявы герба «Пагоня» на адзенні, бела-чырвоныя стужкі і г.д.

У спартовай зале было шмат збітых людзей. Сведкі назіралі, як супрацоўнікі збівалі мужчыну, на якім была майка з выявай «Пагоні». Пасля апытання яго паклалі на падлогу, завярнулі рукі, сталі на ногі і збівалі дубінкамі. (**Сведка Т., Сведка Ш., Сведка Б., Сведка Ю., Сведка В.**)

## 20.00-24.00

Дастаўка затрыманых у РУУС працягвалася і ўвечары. Працэдура папярэдняя: праход праз жывы калідор з людзей у балаклавах і з дубінкамі, які суправаджаўся збіццём; дастаўленне ў спартовую залу з далейшым збіццём, знаходжанне ў спартовай зале са звязанымі рукамі, стоячы на каленях тварам уніз на працягу 6-7 гадзінаў; прымусовае падпісанне пратаколаў; збіццё людзей прама ля сталоў, дзе складаліся пратаколы, ігнараванне просьбаў пра меддапамогу. На просьбы аслабіць рукі ад сцяжак — удары дубінкай. (**Сведка Т., Сведка Ш., Сведка Б.**)

**Сведка Ш.** патлумачыў, што прайшоў праз апісаную вышэй працэдуру і да 21 гадзіны знаходзіўся ў спартовай зале. «Завялі і загадалі падаць на падлогу тварам уніз, пры варушэнні ці павароце галавы пагражалі збіць, рукі ў сцяжках. Пасля сілавікі станавіліся на целы людзей і падымалі затрыманых, каб жанчына-міліцыянтка магла зняць іх на відэа, пры гэтым трэба было назваць ПІБ і год нараджэння. Супрацоўнік з кароткай стрыжкай, гадоў пад 40, заўважыў у яго белы бранзалет і патрабаваў яго «зжэрці».

**Асабліва здзекаваліся сілавікі з мужчыны, у якога знайшлі каністру з газай. Падлетка, які ляжаў на падлозе, перад тым як адпусціць дадому, прымусілі цалаваць абутак міліцыянту.**

## 11 жніўня 2020 года

### 00.00-04.00

У спартовай зале знаходзілася шмат людзей, некаторыя стаялі па перыметры спартовай залы, іншыя ляжалі на падлозе. Мужчынаў, якія ляжалі, супрацоўнікі ў чорным і ў грамадзянскім збівалі і абражалі нецэнзурнымі словамі. Жанчын абражалі нароўні з мужчынамі. Сведка непасрэдна назіраў, як супрацоўнікі білі па каленях яго знаёмых Рамана Ч.[2], а таксама братоў Аляксея і Віктара. Апошні практычна не мог хадзіць, і супрацоўнікі цягнулі яго па падлозе. Зранку адбылася пераменка, новапрыбылыя супрацоўнікі сталі біць людзей паўторна (**Сведка Т.**).

Пазней **Сведку Т.** і яго знаёмых паставілі ля сцяны на калені, рукі сцягнулі сцяжкамі. Братоў Аляксея і Віктара, якія стаялі побач, зноў білі. Аляксею было дрэнна, яго ванітавала, ён пастаянна губляў прытомнасць. Віктар, як і многія іншыя, прасіў пра меддапамогу, але на гэта адказвалі толькі матамі. Яўгену давалі панюхаць нашатыр і зноў білі. Мужчыны прасіліся ў прыбіральню, але іх не пускалі. **Па пахах было ясна, што хтосьці «сходзіў пад сябе». Усіх прымушалі скандаваць «Лукашэнка — наш любімы прэзідэнт».**

Усіх дастаўленых дапытвалі. Тыповы допыт праходзіў наступным чынам. Перад гутаркай з супрацоўнікам затрыманага фатаграфавалі. Калі заўважаліся якія-небудзь асаблівасці на целе (татуіроўка, доўгія валасы і г. д.), наносіліся ўдары. Пратаколы прымушалі падпісваць, не чытаючы. Адзначаецца выпадак, калі пажылога мужчыну за адмову падпісаць пратакол без азнаямлення на працягу 10 хв. метадычна збівалі прама на падлозе кабінета. (**Сведка Т.**)

Падрабязны расповед пра падзеі ночы 11.08. у РУУС утрымліваецца ў сведчаннях **Сведкі Л.** Як і ўсе затрыманыя, сведка прайшоў праз «жывы калідор» і быў дастаўлены ў спартовую залу, дзе ўжо знаходзілася чалавек 200, усе яны або ляжалі на падлозе, або стаялі. Потым сведку і

---

2 Імёны ўсіх пацярпелых зменены, паколькі людзі знаходзяцца ў Беларусі і могуць трапіць пад рэпрэсіі.

яго сяброў кінулі на халодную падлогу тварам уніз. Людзі ляжалі вельмі шчыльна, часам амаль адно на адным. Каб упарадкаваць месца ў спартовай зале, тых хто ляжаў на падлозе перацягвалі прама за кайданкі, кайданкі ўпіваліся ў рукі, і гэта чыніла страшны боль. Затрыманыя ляжалі на падлозе шэрагамі, гэта былі розныя людзі: мужчыны і жанчыны, маладыя і пажылыя, зусім юныя дзяўчаты і хлопцы. Паміж шэрагамі хадзілі супрацоўнікі і білі тых, хто ляжаў, з нагоды і без нагоды. Білі пераважна па спіне і нагах. Сведка бачыў, як трое супрацоўнікаў збівалі маладую дзяўчыну. Асабліва стараліся ў жорсткасці над грамадзянінам Польшчы Дабравольскім Вітольдам, яго білі менавіта за тое, што ён быў з Польшчы. Адзін з затрыманых, у якога былі хворыя ныркі, маліў выклікаць хуткую дапамогу, у адказ ён таксама атрымліваў удары дубінкай.

У спартовай зале знаходзіліся дзевяць міліцыянтаў у масках і супрацоўніца **Карына Валуйская** без маскі. Людзей яны збівалі дубінкамі і нагамі. Радзей рукамі ў пальчатках. Дубінку яны называлі «73 см шчасця». У тых, хто ляжаў, патрабавалі, каб галава была павернутая строга ўніз; калі заўважалі, што галаву хтосьці прыпадняў, у галаву наносіўся ўдар нагой.

Калі пачало віднець, паступіла каманда ўставаць. Хто мог, падымаўся сам, хто не мог — падымалі з «дапамогай» дубінкі. Сілай паднялі і збітую дзяўчыну, яе твар не выражаў ніякіх эмоцый, ёй было ўсё абыякава. Паставілі ўздоўж сцяны і загадалі стаць на калені, спінай уверх, галавой у падлогу. Ногі і рукі зацякалі і было невыносна балюча. Каб неяк палегчыць пакуты, людзі спрабавалі рухаць рукамі і нагамі, але гэта жорстка перарывалася. Не давалі піць і не дазвалялі схадзіць у прыбіральню. Калі нехта быў настойлівы ў просьбах, яго проста білі. Здзекліва, смеючыся, казалі: «Давайце пад сябе. Зараз мы вас будзем біць, а калі будзеце нам тут пэцкаць, мы вас увогуле заб'ем».

Больш за тое, патрабавалі, каб усе разам выкрыквалі фразу «Наш прэзідэнт — Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка». Аднак падпарадкаваліся гэтаму патрабаванню можа 10-20 чалавек, міліцыянтаў гэта злавала, і яны кампенсавалі сваю злосць на тых, хто гэтую фразу не паўтараў.

Асабліва вычварную жорсткасць і злосць выяўляла супрацоўніца з імем **Карына**. Яна пастаянна хадзіла сярод затрыманых і паўтарала: «Вы - пачвары, я з-за вас, сукі, тры ночы запар не сплю». У адной з затрыманых машынаў яна знайшла курыныя яйкі, прынесла іх у спартовую залу, а потым загадала мужчынам устаць і прысядаць. Людзі з адбітымі дубінкамі, сінімі нагамі не маглі гэта рабіць і падалі, а Карына са смехам услед штурхала іх нагамі. **Тых, хто ўпаў, Карына штуршкамі ў твар прымушала**

**ўставаць і кідала ў іх курыныя яйкі. Кідала яйкі ў вобласць пахвіны, у тулава, у твар, а потым брала ў іншых супрацоўнікаў дубінку і азвярэла, са страшным крыкам, біла.**

У такой абстаноўцы сведка і ўсе астатнія затрыманыя прастаялі ля сцяны спартовай залы 9 гадзінаў.

Яшчэ адзін сведка (**Сведка Н.**), таксама дастаўлены ўначы, у спартовай зале знаходзіўся нядоўга. Яго і яшчэ двох, у тым ліку аднаго непаўнагадовага, вывелі ў калідор і паклалі на падлогу. Ляжалі на жываце, рукі за спінай у наручніках, ляжаць загадалі з шырока рассунутымі нагамі, падымаць галаву забаранялася. Праз гадзіны паўтары прыйшлі нейкія людзі і пачалі дапытваць. Галоўнае пытанне, якое іх цікавіла, колькі ім было заплачана за ўдзел у мітынгу. Сведка адмаўляў як удзел у шэсці, так і атрыманне грошай, і таму быў збіты дубінкай: білі па спіне і нагах. Бачыў, як збівалі і непаўнагадовага хлопца. Супрацоўнікі абвінавачвалі сведку ў тым, што ён атрымаў за ўдзел у мітынгу 50 рублёў, і яго пасадзяць у турму. Сцвярджалі, што імі затрыманы каардынатар і ім усё вядома. У выпадку хоць нейкага пярэчання пачыналі біць. Скончыўся допыт здымкамі на відэа, пасля чаго супрацоўнікі сышлі. Ён з іншым мужчынам праляжаў у калідоры на халоднай плітцы да раніцы, толькі тады яго перавялі ў спартовую залу.

**Сведка Г.** дастаўлены ў Фрунзенскі РУУС прыкладна ў 2 гадзіны ночы. На ўваходзе супрацоўнікі прымусілі легчы на падлогу, некалькі разоў ударылі дубінкай, надзелі кайданкі, абражалі, абвінавачвалі, што зладзілі хаос, разбурылі горад. Прывялі ў спартовую залу, загадалі легчы. На ўваходзе бачыў 20-30 разбітых тэлефонаў. Чуў і бачыў, як збівалі людзей.

Прыкладна ў 2.30 гадзіны **Сведку П.** і яшчэ двух грамадзянаў даставілі ў Фрунзенскі РУУС. Усіх, каго заводзілі ў гэтую спартовую залу (у тым ліку і іх), збіваў шэраг супрацоўнікаў міліцыі. Яго і іншых паклалі тварам у падлогу, надзелі наручнікі — вельмі туга, зацягнуўшы іх за спінай. Калі ляжаў на падлозе, да яго падышоў супрацоўнік міліцыі, які адклікаўся на імя па бацьку «Пятровіч», наступіў яму нагой на галаву, задаў нейкія пытанні і ўдарыў дубінкай па твары, разбіўшы вусны.

**Білі і многіх іншых: за размовы, просьбы вады ці медыцынскай дапамогі, калі павярнуўся на бок ці памяняў сваё становішча, за знешні выгляд, наяўнасць якой-небудзь атрыбутыкі. Так працягвалася ўсю ноч. У зале знаходзіўся малады чалавек, які неаднаразова казаў, што ў яго адна нырка, што яму нядаўна зрабілі аперацыю, што яму нельга зна-**

**ходзіцца ў такім становішчы, у якім ён знаходзіцца цяпер, яно для яго вельмі балючае. Ён шмат разоў прасіў выклікаць яму хуткую дапамогу, але ў адказ на яго просьбы яго збівалі ўсё больш і больш.**

## 04.00-10.00

**Сведка А.**, дастаўленая ў 4 гадзіны ночы, распавядае: збівалі ўсіх жорстка. Дзяўчат асабліва не чапалі, але адну дзяўчыну пераблыталі з хлопцам і пачалі збіваць па спіне і ягадзіцах дубінкай. Хлопец заступіўся, яго сталі біць у твар. Яна распавяла пра факт збіцця маладога чалавека з адной ныркай і пацвердзіла, што людзей у прыбіральню не выводзілі.

Яна бачыла затрыманага, якога цягнулі па калідоры ўсяго ў крыві, і за ім заставалася паласа крыві. А 4 гадзіне ранку яе і некаторых іншых затрыманых па адным выводзілі са спартовай залы і фатаграфавалі. У калідоры іх біў па нагах супрацоўнік у чорнай форме і пытаўся: «Будзеце яшчэ хадзіць на мітынгі?» Аднаго з хлопцаў абвінавачвалі па крымінальным артыкуле, і яго ў калідоры збівалі яшчэ мацней. Пасля падпісання дакументаў (чытаць не давалі) яе завялі ў камеру ў РУУС («малпоўня»), дзе было 7 чалавек, хаця камера разлічаная на чатырох.

**Сведка П.** распавядае, што зранку малады супрацоўнік міліцыі ўсіх паставіў на калені, тварам у падлогу. Ён збіваў тых, хто прасіўся ў прыбіральню, (і) прасіў медыцынскую дапамогу, задаваў якія-небудзь пытанні, часам удары наносіліся ўвогуле беспадстаўна. Ён прымушаў затрыманых казаць: мы любім Беларусь, усе мы любім нашага прэзідэнта Лукашэнку, мы не будзем больш граміць горад і іншыя выразы. Тых, хто не крычаў, не казаў гэта, ён збіваў дубінкай. Супрацоўніца міліцыі, меркавана яе завуць **Карына Валуйская**, падыходзіла да **Сведкі П.** і іншых, усяляк прыніжала і абражала. Яна ўзяла з аўтамабіля курыныя яйкі і засоўвала ім у кішэні. Пасля гэтага наносіла ўдары туды, дзе ляжала курынае яйка, каб яно разбілася. Яна таксама наносіла ўдары па твары, па нагах. Яго і іншых затрыманых вадзілі на допыты, падчас якіх збівалі. Білі па каленях, па ступнях, галёнцы.

Зранку ў спартовай зале знаходзілася каля 80 чалавек, у тым ліку 8-10 дзяўчат. Прыйшло некаторае паслабленне: дазволілі схадзіць у прыбіральню і папіць вады, камусьці паслабілі кайданкі, хто стаяў - дазволілі прысесці (**Сведка Н.**).

Каля 8 гадзінаў прыйшла пераземенка і ўвесь жах пачаўся наноў. Усіх затрыманых зноў паставілі на калені ўздоўж сцяны спартовай залы ў два шэрагі галавой уніз. Варушыцца нельга, вады нельга, у прыбіральню нельга. У складзе пераземенкі была супрацоўніца з імем Крысціна. У торбе аднаго з затрыманых яна знайшла, на яе погляд, падазроныя прадметы і пачала збіваць яго бітай. Біла яго вельмі жорстка і збіццё суправаджала немым крыкам. Побач знаходзіўся мужчына ва ўзросце 40-50 гадоў, ён прасіў яго не біць, паколькі ў яго хворая спіна. Некаторыя не маглі доўга стаяць на каленях і malілі: «Лепей забіце мяне, я не магу больш так стаяць». За любыя просьбы і нават рэплікі затрыманыя, у тым ліку і дзяўчаты, атрымлівалі серыі ўдараў. Потым у залу зайшлі амапаўцы і пачалі прымушаць затрыманых выкрыкваць, што самы лепшы прэзідэнт - гэта Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка (**Сведка Н., Сведка Г.**).

Тэлефоны затрыманых былі ў пакетах, якія яны трымалі за спінай. Супрацоўніца **Валуйская**, пачуўшы гук тэлефона, забірала яго і кідала аб падлогу і ў сцены, пакуль не разбіваўся, і потым кідала ў чалавека. Хтосьці папрасіў адключыць тэлефон, і яна падыходзіла і адключала іх. Яна казала: «Калі я пачую хоць адзін гук ад тэлефона, яны будуць там жа, дзе і тыя першыя». **Сведка Ц.** свой тэлефон змог выключыць праз пакет. Але ў многіх стаялі будзільнікі, і ў каго гралі будзільнікі, яна таксама іх «рамантавала». Так яна разбіла каля 10 тэлефонаў дубінкай і вяртала разбітыя (**Сведка Ц., Сведка К., Сведка Х.**).

Зранку **Сведку Г.** і яшчэ двох павялі падпісваць пратакол. У белай кашулі зайшоў начальнік РУУС **Палулех Аляксандр Уладзіміравіч**. Ён крычаў і абражаў іх. Кожнага ўдарыў галавой аб сцяну. Прыйшла супрацоўніца **Карына Валуйская**, дастала з яго кішэні інгалятар, дала падыхаць, перыядычна давала яму нюхаць нашатыр, паколькі ён вельмі дрэнна сябе адчуваў. Пазней падышла і сказала, што трэба на камеру сказаць, што ўдзельнічаў у маршы, прызнае віну, не хацеў жорсткіх дзеянняў. Паабяцала, што пасля гэтага **Сведку Г.** адпусцяць. Ён вымушаны быў згадзіцца і на камеру сказаў, што было прапанавана.

## 11.30 - 16.00

Дастаўленыя каля 12 гадзінаў (**Сведка Р., Сведка С.**), пацвярджаючы збіццё, дапоўнілі: усіх прымушалі крычаць: «Мы больш не будзем разбураць сваю краіну, мы любім нашага прэзідэнта, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка наш адзіны прэзідэнт». Хто не казаў, адразу атрымлівалі ўдары. Аднаго хлопца паставілі на тумбу, надзелі каску, і **Карына Валуйская**,

супрацоўніца міліцыі, пачала яго збіваць сталёвай бітай па галаве. Каска была пластыкавая, а біта сталёвая. Ён падаў, яго за каўнер падымаюць, ставяць, зноў пачынаюць біць.

Пачалі моцна збіваць хлопца. Ён ад гэтага згубіў прытомнасць. Затрыманыя крычалі: «Выклічце хуткую, чалавеку дрэнна». Да яго падышлі, паштурхалі, ён не адгукаецца, далі панюхаць нашатыр, ён крышачку прыйшоў у сябе. **Супрацоўнікі: «А, ты яшчэ не памёр» і працягвалі ці тое дубінкай, ці тое нагамі дабіваць** (**Сведка Р.**).

## 16.00 - 20.00

**Сведка Ч.** дастаўленая ў Фрунзенскі РУУС у спартовую залу а 18-й гадзіне, ёй надзелі кайданкі і паставілі на калені тварам уніз. Асабіста бачыла масавае збіццё мужчынаў. Збітых прымушалі крычаць: «Люблю АМАП». Асабліва вычваралася ў жорсткасці дзяўчына-супрацоўніца **Карына Валуйская**, якая біла хлопцаў дубінкай па галовах і па іншых частках цела. Калі прасілі пра выклік меддапамогі, гэта яшчэ больш раздражняла сілавікоў. Збіццё суправаджалася адборным матам і абразамі. Збіццём займаліся як людзі ў чорным, так і супрацоўнікі міліцыі. На падлозе ў спартовай зале было шмат крыві, крывёю былі запырсканыя і сцены.

## 21.00 - 23.00

Як распавядаў **Сведка Ж.**, яго завялі ў спартовую залу і кінулі на падлогу тварам уніз. Падышлі 2 сілавікі і пачалі збіваць дубінкамі па ягадзіцах і спіне. Пасля ўдараў дубінкамі, адзін з гэтых супрацоўнікаў, сеў на спіну затрыманаму, каленам упёрся, пачаў біць кулаком у правую частку спіны. Ён нанёс як мінімум 5 удараў у вобласць лёгкага, ад чаго ён пачаў задыхацца, хрыпець. Потым другі наступіў на палец нагі і стаяў на ім, пакуль **Сведка Ж.** не закрычаў, потым устаў на ягадзіцы і некалькі разоў скакаў на ім. Абразы былі пастаянна («Пудзіла», «жывёла», «мразь», нецэнзурная лаянка). Усіх прымушалі стаяць на кукішках галавой у падлогу, рукі за спінай скоўвалі кайданкамі ці сцяжкамі.

**Сведка З.** адзначыў, што яго і іншых дастаўленых у РУУС каля 22 гадзінаў па выхадзе з мікрааўтобуса пазначалі шэрай фарбай: дзяўчатам толькі на шыю, а мужчынам нанеслі шэрую фарбу і на спіну. У спартовай зале туга надзелі кайданкі, пасадзілі на калені тварам уніз. Недалёка знаходзіліся

тры маладыя чалавекі. Аднаго з іх збівалі каля пяці сілавікоў. Як даведаўся пазней, яны ўцякалі ад ДАІ і АМАПу на аўтамабілі, іх затрымалі. Іх збівалі нагамі, дубінкамі, шокерам. Гэта доўжылася прыблізна 20 хвілінаў. Пазней зноў падыходзілі і збівалі.

Супрацоўнік ДАІ завёў яго ў кабінет. Адзін з тых, хто знаходзіўся ў памяшканні, сказаў: «Мы цябе зараз будзем дапытваць». **Сведку З.** паклалі на зямлю тварам уніз і супрацоўнік міліцыі пачаў збіваць гумовай дубінкай па нагах і па ягадзіцах, часам біў па спіне. Пасля пяці-дзесяці хвілінаў сказаў, што рука стамілася. Збіццё суправаджалася словамі: «Няма чаго галасаваць за Ціханоўскую, пераменаў вам не бачыць». Праз некаторы час яго павялі ў перапраналку. Там знаходзіліся трое ў форме: чорная майка, чорныя штаны, берцы, чорная маска і двое былі ў балаклавах. Прымушалі запісваць на камеру ўсё, што яны скажуць. Калі запнуўся, то падыходзілі, наносілі два ўдары па нагах з двух бакоў і нанова пачыналі запіс. **Сведку З.** прымусілі сказаць, што прымаў удзел у мітынгу і выкрыкваў лозунгі «Жыве Беларусь!», нецэнзурна выказваўся ў адрас супрацоўнікаў АМАПу, якія выконвалі свой абавязак на вуліцы Прытыцкага, хаця яго затрымалі на вул. Бельскага. Вымушаны быў сказаць, як патрабавалі.

Калі здаваў рэчы дзвюм супрацоўніцам міліцыі, міма праходзіў супрацоўнік РУУС і ўдарыў «з нагі» яму ў грудзі. Ад першага ўдару **Сведка З.** выстаяў, тады сілавік нанёс яшчэ два ўдары. Калі ён зноў застаўся стаяць на нагах, ударыў чацвёрты раз. Чацвёрты ўдар збіў дыханне, **Сведка З.** упаў, пачаў задыхацца, не мог удыхнуць паветра. Бачыў трох хлопцаў, якія ляжалі ў лужыне крыві метр на тры метры. **Крыху пазней убачыў, што трое сілавікоў вынеслі аднаго з хлопцаў са спартовай залы. Прыкметаў жыцця ён увогуле не падаваў, быў увесь акрываўлены.** Калі **Сведка З.** знаходзіўся ў камеры ў РУУС, бачыў сляды збіцця: у Андрэя С. усе ногі і спіна былі цалкам чорнымі, яшчэ ў трох збітых чалавек ягадзіцы і ногі былі фіялетавага колеру. У шостага — Захара — на твары была вельмі вялікая гематома, вока зацякло. Ён распавёў, што, убачыўшы ў яго тэлефоне падпіску на канал «NEXTA», два супрацоўнікі трымалі яго, які сядзеў на падлозе спартовай залы, каб ён не падаў, а трэці наносіў перыядычна ўдары ў галаву абуткам. Пасля нейкага ўдару ён адключыўся.

Супрацоўніца РУУС **Карына Валуйская** з яшчэ адным супрацоўнікам «гулялі ў бейсбол». Ён ёй накідваў забраны ў затрыманых тэлефон, а яна адбівала яго дубінкай. І так яна біла ўсе тэлефоны, якія тэлефанавалі і заміналі ёй спакойна працаваць, як яна выказвалася. З адміністратыўным пратаколам не знаёміўся, паколькі адразу папярэджвалі, што будуць біць.

**Сведку У.** 11 жніўня каля 9-ці гадзінаў вечару прывезлі ў РУУС. Калі выгружалі, беглі праз «калідор» пад ударамі дубінак АМАПу. У РУУС у двары прасядзелі на каленях каля гадзіны. Потым іх расфармавалі ў боксы — гараж. Там былі толькі голыя сцены. Іх паставілі ўздоўж дзвюх сценаў, стоячы да сцяны галавой уніз. Забаранялася з кім-небудзь размаўляць, глядзець. Сцяжкі зацягнутыя былі даволі туга, у некаторых людзей ужо пачыналіся праблемы. Многіх прывозілі ў крыві, з паламанымі нагамі. Людзі прасілі медыцынскую дапамогу, на што першапачаткова груба адказвалі, што да іх ніхто не прыедзе. Калі яны ўжо бачылі, што чалавек упаў і не можа падняцца, то абяцалі, што хуткая прыедзе. Адзначае, што пасля ад'езду АМАПу супрацоўнікі РУУС ставіліся лаяльна: далі магчымасць папіць вады, дазволілі ўзяць з асабістых рэчаў цыгарэты. Перыядычна супрацоўнікі АМАП прывозілі затрыманых. З іх прыездам умовы мяняліся катэгарычна жорстка ў параўнанні з супрацоўнікамі РУУС: ні паразмаўляць, ні ў прыбіральню, ні вады. У многіх ацякалі рукі ад таго, што туга зацягнутая сцяжка. Паказальны выпадак: чалавек прасіць крышачку расслабіць сцяжку. Падыходзілі, зацягвалі яшчэ больш. Калі з'язджалі АМАПаўцы, супрацоўнікі дазвалялі сядаць. Калі прыязджалі супрацоўнікі АМАП, то стаялі або на каленях, або ў вышэй апісанай позе, сядзець катэгарычна не дазвалялася. Так працягвалася да абеду дванаццатага жніўня.

**Сведку Ц.** утрымлівалі ў ціры Фрунзенскага РУУС. Ля дзвярэй затрыманага падхопліваў адзін з супрацоўнікаў і вёў у падвал, у цір (там былі мішэні на сценах, і супрацоўнікі так называлі гэтае месца). Пакуль беглі па РУУС, сілавікі перадавалі адзін аднаму затрыманых і кожны біў іх дубінкамі.




Пацярпелы распавядае, што калі яго прывялі ў цір, там на падлозе ляжалі прыкладна 10-12 чалавек. Іх паклалі на падлогу прыблізна ў метры адно ад аднаго тварам у падлогу, трымаючы рукі за спінай. **Трое сілавікоў праходзілі каля іх і наносілі дубінкамі і нагамі ўдары па нагах, ягадзіцах, спіне, баках. Многія крычалі ад болю, крычалі «Спыніцеся!». Але яны не спынялі збіццё. Кожны з тых, хто ляжаў, атрымаў не менш за 20 удараў.**

Як паведамляе **Сведка Ц.**, калі іх перасталі збіваць, ім надзелі на рукі кайданкі і так яны праляжалі ў ціры каля трох гадзінаў.

За гэты час апытанага двойчы выводзілі ў калідор для допытаў. Супрацоўнікаў РУУС цікавіла, ці ёсць сярод затрыманых рускія і ўкраінцы. **Сведка Ц.** сказаў, што ён рускі. Яго паднялі, выцягнулі ў калідор і пачалі біць дубінкамі і кулакамі ў жывот, рэбры, сонечнае спляценне. Адзін сілавік трымаў яго, іншы біў. Так яму нанеслі каля пяці ўдараў. Сілавікоў цікавіла прычына прыезду і хто каардынуе беспарадкі.

Другі раз яго дапытвалі і катавалі пасля агляду яго тэлефона. На шляху ў калідор моцна збілі, асабліва пацярпела правая нага.

У калідоры двое супрацоўнікаў уставілі швабру яму за спінай пад лапаткі, рукі былі ў кайданках. Такім чынам ён вісеў на швабры. Паколькі ногі былі моцна пашкоджаныя, ён не мог стаяць. 2-3 супрацоўнікі білі яго дубінкамі і нагамі. Увесь гэты час адзін стаяў з яго тэлефонам і крычаў: «Давай распавядай, паказвай мне ўсе нумары, як ты гэта патлумачыш?!». Калі стала моцна балюча, пацярпелы сказаў: «Спыніцеся, я ўсё патлумачу». Ён адразу пачаў крычаць: «Давай нумары, а то мы зараз увогуле заб'ем [цябе]».

Пасля ціра затрыманых вывелі ў спартовую залу, дзе было каля 100 затрыманых. Усе яны былі збітыя, твары, рукі ў крыві і сіняках. Падлога ў спартовай зале была ў крыві, людзі стаялі тварам да сцяны, хто на каленях, упіраючыся галавой у падлогу, хто на нагах. Было чуваць крыкі, удары дубінкай. Да людзей падыходзілі сілавікі і перыядычна наносілі ўдары дубінкамі, у асноўным па нагах, па ягадзіцах. Тыя, хто збівалі, былі ў масках (**Сведка Ц., Сведка К., Сведка Х.**).

Насупраць людзей стаялі тры сталы, як школьныя парты, за імі сядзелі супрацоўніцы РУУС у медыцынскіх масках. Яны апісвалі асабістыя рэчы, складалі пратаколы. Па чарзе клікалі затрыманых па спісе. З боку супрацоўнікаў стаўленне абразлівае.

Пасля гэтага зноў усіх пасадзілі да сцяны, і яны так прасядзелі да 11 раніцы. А ў спартовую залу завялі ў тры ночы. Такім чынам, збітыя затрыманыя правялі ўсю ноч без сну, у кайданках.

Кайданкоў на ўсіх не хапала і многім затрыманым рукі сцягвалі сцяжкамі. Часта кайданкі сцягвалі вельмі моцна, з-за чаго рукі сінелі.

Супрацоўнікі налівалі ў прыбіральні паўтаралітровую бутэльку вады, падносілі да роту затрыманаму і давалі зрабіць пару глыткоў.

### 00.00

На падлозе спартовай залы ляжалі больш за 100 чалавек. **Сведку Ф.** знялі сцяжкі, надзелі кайданкі. Яму было цяжка ісці, паколькі моцна балела збітая левая нага. Падыходзілі сілавікі, некаторыя наносілі ўдары. Затрыманыя стаялі на каленях, тварам у падлогу, рукі за спінай. Яго ўдарылі, паднялі на ногі і павялі ў распраналку. На камеру яго распытвалі пра анкетныя дадзеныя, колькі заплацілі. Нанеслі некалькі ўдараў у жывот. Вярнулі ў залу, дзе пазней праходзіў вопіс рэчаў.

Яго падняў супрацоўнік-мужчына ў чырвонай майцы, балаклаве. Падводзячы да стала, нанёс удар кулаком у сонечнае спляценне, ад якога **Сведка Ф.** упаў на падлогу. Не далі прачытаць вопіс, атрымаў удар у твар. Потым, калі ўжо ляжаў на падлозе, падыходзілі некалькі супрацоўнікаў, наносілі ўдары. Адзін з іх некалькі разоў скакаў на яго правай назе. У нейкі момант ён пачынаў губляць прытомнасць. Хадзіць ужо не мог, ад удараў балела галава. Нейкі супрацоўнік адкачваў яго нашатырам. Потым усе сядзелі, аб сцяну апірацца было нельга. Зранку выклікалі хуткую, але да яго лекара не падвялі. У дачыненні да яго і іншых склалі пратаколы. Яму не далі прачытаць, вымушаны быў падпісаць.

Не ўсе рэчы былі ўнесеныя ў вопіс вынятай маёмасці: 140-160 рублёў прапалі з кашалька; частку крэдытных картак разламалі. Тэлефон разбілі аб стол (**Сведка Ф.**).

## 12 жніўня 2020 года

### 00.00-04.00

Затрыманых уначы, якіх дастаўлялі ў Фрунзенскі РУУС, працягвалі размяшчаць у спартовай зале. Да поўначы іх там было каля 100 чалавек. Затрыманыя адзначаюць, што іх збівалі міліцыя і АМАП: паклалі на падлогу і білі дубінкамі так, што ламаліся дубінкі. Пасля збіцця іх паклалі на падлогу ў кайданках, перыядычна падымалі і ставілі да сценкі, пастаянна патрабавалі паролі і тлумачэнні па змесце ў тэлефоне.

Мужчыны практычна ўсе былі збітыя і ляжалі тварам у падлогу, жанчыны сядзелі на каленях тварам уніз. Здзекі працягваліся практычна ўсю ноч і раніцу без аніякай прычыны.

Жанчын білі рэдка, але яны адзначаюць, што ім было вельмі страшна, таму што мужчынаў збівалі пастаянна на іх вачах. Да затрыманай дзяўчыны падышоў мужчына ў сіня-белай спартовай форме, цяжкіх красоўках ці берцах. Вельмі высокі, поўны, гадоў 50. Ён пяткай красоўка ўдарыў дзяўчыну па ілбе і сышоў, нічога не кажучы. Праз некалькі гадзінаў з дзяўчат знялі кайданкі. Калі прачытала краем вока свой пратакол, убачыла, што яе нібыта затрымалі на Каменнай горцы ў 1 гадзіну 50 хв. (праз гадзіну пасля рэальнага затрымання) і што яна выкрыквала лозунгі: «Свабоду Статкевічу», «Свабоду Севярынцу». Яна падпісала гэты пратакол. Мужчынаў білі дубінкамі людзі без формы, у спартовым адзенні ці джынсах, майцы. На тварах у іх былі маскі ці балаклавы (**Сведка Е**.).

Каля 2 гадзінаў ночы прывезлі мужчыну, па яго словах, інваліда. Супрацоўнік са смуглым тварам збіў яго да такой ступені, што збітага звезла хуткая дапамога.

Каля 2 гадзінаў 30 хвілінаў аднаго з затрыманых вывелі з будынку РУУС, паколькі ён адчуў сябе блага. Аднак на вуліцы з яго працягвалі здзекавацца. Яго адвялі ў аўтазак і там дубінкай працягвалі збіваць па ягадзіцах. Пасля гэтага сілавік у балаклаве дастаў аркуш паперы, скамячыў і прымушаў з'есці гэтую паперу, потым сам адкрыў яму рот і засунуў туды гэтую паперку. У прамежку з 2 да 3 ночы затрыманага завялі ў РУУС у ЦІР. Паклалі тварам уніз, там у той момант знаходзілася каля 15 чалавек. Былі супрацоўнікі ў балаклавах у сіняй форме. У ціры знаходзілася дзяўчына, ёй не скоўвалі кайданкамі рукі і ёй дазвалялі сядзець, яна часам давала ім піць ваду.

У двары РУУС сілавікі каталіся на джыпе БМВ, які належаў затрыманым (**Сведка К., Сведка Ш., Сведка Л., Сведка Я., Сведка Э., Сведка Е.**).

Да **2 гадзінаў ночы** ў зале ў гэты час знаходзілася ўжо каля 200 затрыманых, сярод іх дзяўчат — 10-15. Усе ляжалі ўздоўж сценаў, блізка адно да аднаго, тварам уніз, у кайданках ці сцяжках. **Уся спартовая зала была ў крыві, на шляху да спартовай залы таксама былі сляды крыві. У памяшканні, нягледзячы на адчыненыя вокны, дрэнна пахла потам, мачой, крывёю.**

Супрацоўнік міліцыі паказаў затрыманай на хлопца, у якога былі брудныя штаны, і сказаў: «Бачыш, абасраўся. І з табой будзе тое ж». Амапаўцы крычалі: «Медыкі тут!». (Пазней **Сведка РР.** даведалася, што АМАПу давалі бонус за журналістаў, медыкаў. З 9-га да 12-га жніўня ў іх было «спаборніцтва», які РУУС больш за іншыя затрымае гэтыя катэгорыі пратэстоўцаў).

Ва ўсіх памяшканнях РУУС збівалі людзей. На падлозе ў адным з кабінетаў ляжалі 6-7 чалавек, а 2-3 супрацоўнікі збівалі іх дубінкамі, нагамі па ўсім целе. Аднаго хлопца паднялі з падлогі і кулаком ударылі ў твар. Усе гэтыя дзеянні здымалі на камеру. Дзяўчат дубінкамі не білі, у асноўным рукамі, больш было псіхалагічнага гвалту: пагражалі, запалохвалі, абражалі. У наданні медыцынскай дапамогі груба адмаўлялі.

Затрыманую і яе сябра Е. пазначылі чырвоным і чорным крыжом. Гэта азначала, што да іх увага павінна быць большая — іх білі мацней. У хлопца ў заплечніку знайшлі рацыю. За гэта яго вельмі моцна збівалі: каленам у грудзі, у жывот, хлопец падаў, і яго працягваюць збіваць нагамі і дубінкамі.

**Сведка РР.** бачыла хлопца, якому разрэзалі джынсы ззаду і трусы, без канца білі па ягадзіцах, нагах. Ён потым распавёў, што яго збілі пры затрыманні, і потым пастаянна білі, паколькі ў яго на тэлефоне была застаўка - бела-чырвона-белы сцяг. Пра гэта распавядае таксама **Сведка НН.**

Дзяўчыну прымусілі падпісваць паперы, не чытаючы, пад пагрозай збіцця.

**Да сярэдзіны ночы** людзей стала вельмі шмат, людзі ляжалі ўпрытык адно да аднаго. Збіццё і абразы не спыняліся: пры даглядзе тэлефонаў, пры падпісанні пратаколаў. АМАПаўцы наносілі ўдары дубінкамі. Затрыманых здымалі на камеру пры адборы персанальных дадзеных (**Сведка НН**).

## 04.00-08.00

А 4 гадзіне ў спартовай зале знаходзілася чалавек 200, пасярэдзіне памяшкання стаялі чатыры сталы, за імі сядзелі людзі. У спартовай зале пастаянна прысутнічалі сілавікі ў чорнай амуніцыі, у балаклавах і берцах (**Сведка ЕН.**).

Некаторыя з затрыманых пачалі падпісваць пратаколы. Тых, хто не хацеў падпісваць без прачытання, збівалі. Многія прасілі выклікаць лекара, але на іх ніхто не звяртаў увагу. Працягвала старацца супрацоўніца **Карына Валуйская**. Яна паводзіла сябе ў дачыненні да затрыманых вельмі агрэсіўна: разбівала тэлефоны, якія званілі, прымушала адціскацца, прысядаць, абражала, біла дзяўчат па твары (**Сведка Л., Сведка Е., Сведка РЛ.**).

## 08.00-12.00

У камеры РУУС затрыманыя правялі ноч, доступу да вады і прыбіральні не было. А 8 раніцы іх разбудзіў супрацоўнік РУУС, дазволіў схадзіць у прыбіральню насупраць камеры і папіць там вады.

Бліжэй да абеду ўсіх, хто застаўся ў камерах (каля 80 чалавек), прывялі ў спартовую залу і паставілі тварам да сцяны. Потым іх падзялілі па 5 чалавек у шэраг і кожныя 5 шэрагаў выходзілі на вуліцу шарэнгай, беглі сагнутыя пад 90 градусаў, галавой уніз, адно за адным (**Сведка НН.**).

Прыкладна а 12 гадзіне ўсіх, на каго аформілі дакументы ў спартовай зале, паставілі ў шарэнгі і вывелі са спартовай залы бегам праз жывы калідор пад збіццё, змясцілі ў аўтазакі і звезлі (**Сведка ЕН.**).

## 16.00-20.00

Затрыманых размясцілі **ў ціры**, паставілі на калені. Тых, хто адмаўляўся назваць пароль ад тэлефона, збівалі нагамі і дубінкамі. Збіццё хлопца працягвалася каля 1 гадзіны і суправаджалася страшнымі абразамі, па чарзе білі 8-10 чалавек (**Сведка ДД.**, **Сведка ДЕ.**, **Сведка ДВ.**, **Сведка ДА.**, **Сведка ДЖ.**).

## 20.00-24.00

Затрыманы быў дастаўлены ў Фрунзенскі РУУС каля 20:30 гадзінаў. На працягу трох гадзінаў яго катавалі ў памяшканні, якое супрацоўнікі РУУС называлі “катавальняй”. Затрыманага паклалі на падлогу і пачалі дапытваць па змесце тэлефона. Падчас адказаў білі дубінкай і нагамі па нагах, спіне і ягадзіцах. Сілавікоў цікавіла, хто каардынатар пратэстаў і хто плаціць за ўдзел у пратэстах. Пры затрыманым абмяркоўвалі, як яго будуць закапваць у зямлю (**Сведка А.**).

З ціра затрыманых перавялі **ў спартовую залу**. У гэты час там было каля 50 чалавек. Хлопцаў працягвалі жорстка збіваць. Затрыманая распавядае, што яе сябра збівалі да такой ступені, што супрацоўнікам РУУС давялося самім выклікаць хуткую для яго.

Некаторых дзяўчат дапытвалі з пагрозамі прымянення шыла, патрабавалі назваць саўдзельнікаў, білі па твары падчас допыту (**Сведка ДД.**).

Тых затрыманых, каго прывезлі ў РУУС увечары, таксама сустракаў жывы калідор з сілавікоў, які збіваў людзей пры ўваходзе. Людзей падпісвалі па нумарах прама на спіне, а на назе разразалі штаніну і пісалі месца затрымання. Усіх мужчынаў, якія прыбылі, моцна збівалі дубінкамі па спіне, ягадзіцах. Людзі крычалі, прасілі не біць, былі ў шокавым стане. Падлога пахла фекаліямі, мачой. Сілавікі асабліва лютавалі над хлопцам, які пры збіцці не крычаў. «Ты крамень», - яны лупілі яго са страшнай сілай, але ён так і не закрычаў" (**Сведка ВВ.**).

Знаходзіліся ў РУУС да **позняга вечару 12 жніўня**. Калі іх прымусілі бегчы ў аўтазак, зноў была шарэнга з міліцыі і АМАПаўцаў, якія білі дубінкамі (**Сведка П.**).

## 13 жніўня 2020 года

### 00.00-04.00

Каля 2 гадзінаў затрыманых пачалі выводзіць, каб даставіць на Акрэсціна. На вуліцы перад аўтазакам людзей зноў збівалі (Сведка ДД., Сведка ФФ.).

## НАСТУПСТВЫ КАТАВАННЯЎ

Разуменне таго, дзе менавіта былі атрыманыя канкрэтныя траўмы, ускладняецца тым, што затрыманых збівалі на ўсіх этапах (гл. Шостую прамежкавую справаздачу Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў: скаардынаваная палітыка катаванняў[1]) - затрыманне, транспартаванне, у РУУС і іншых месцах утрымання. Медыцынская дапамога ім не надавалася, за выключэннем рэдкіх, часта крытычных, выпадкаў.

Уначы 14 жніўня людзей пачалі масава адпускаць. Часцей за ўсё па медыцынскую дапамогу пацярпелыя звярталіся ў дзяржаўныя клінікі, таксама бясплатныя паслугі надавалі некаторыя прыватныя цэнтры. Адначасова з гэтым пачаліся складанасці з праходжаннем судова-медыцынскай экспертызы: адмена платных экспертызаў. У той перыяд прайсці судова-медыцынскую экспертызу можна было толькі па накіраванні са следчага камітэта, куды большасць пацярпелых звяртацца не хацелі і баяліся з-за магчымага пераследу за ўдзел у пратэстах. Лекары ж апісвалі траўмы пацярпелых настолькі падрабязна, наколькі маглі. У той жа перыяд групай судова-медыцынскіх экспертаў быў створаны дапаможнік для лекараў пра тое, як правільна апісваць траўмы, каб не згубіць інфармацыю.

Асноўнымі дыягназамі, якія ставіліся ў тыя дні, былі шматлікія раны, удары, кровападцёкі і гематомы ў вобласці спіны, ягадзіц і ног. (**Сведка І., Сведка**

1 https://drive.google.com/file/d/14z5uutRO7t09lKpg85OtoI3aoXJixNvT/view

**Ф., Сведка О., Сведка РЛ., Сведка ЕН.**). Большасць з іх расцэньвалася як пашкоджанні лёгкай і сярэдняй цяжкасці, хаця аднаўленне магло займаць ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў, але нейкіх сур'ёзных ускладненняў яны не выклікалі.

Шмат хто адзначае траўмы каленяў з-за працяглага стаяння на іх (**Сведка І., Сведка Т., Сведка ЖК.**). У частні апытаных пачаліся ўскладненні (**Сведка Ф., Сведка Б., Сведка Н.**). Частымі былі траўмы рэбраў, спіны, кісцяў рук, а таксама чэрапна-мазгавыя траўмы, скаргі на боль у нырках і груднай клетцы. Некаторыя траўмы мелі доўгатэрміновы эфект і патрабавалі працяглага аднаўлення - да некалькіх месяцаў, як, напрыклад, страта адчувальнасці ў канцавінах, частковая страта слыху, праблемы з сэрцам, пераломы пазванкоў (**Сведка І., Сведка ЕН., Сведка Б., Сведка ТБ., Сведка Ф.**).

Некаторыя пацярпелыя лічылі свае пашкоджанні нязначнымі, таму па дапамогу яны не звярталіся (**Сведка Г., Сведка ДД., Сведка Л., Сведка ФФ.**). Таксама частка пацярпелых не хацела звяртацца да медыкаў з-за боязяў далейшага пераследу (**Сведка ЖК.**).

Многія пацярпелыя апісваюць свой эмацыйны стан пасля перажытага як стабільны, але дадаюць таксама, што першы час адчувалі шок, прыгнечанасць, баяліся людзей у форме і транспарта, падобнага на той, які выкарыстоўваўся сілавікамі пры затрыманні (**Сведка Г., Сведка З., Сведка ДД.**). Некаторыя казалі пра тое, што ім страшна знаходзіцца ў горадзе і месцах, дзе адбывалася затрыманне. «На Пушкінскай быў нейкі затор невялікі, вось там я ўпершыню закрыўся ў машыне» (**Сведка АМ., Сведка І.**). Пацярпелыя, якія звярталіся па псіхалагічную дапамогу, казалі пра такія дыягназы як дэпрэсія, неўрастэнія, посттраўматычны сіндром. «Першыя дні мы крычалі ў сне, пасля таго як нас выпусцілі» (**Сведка РР.**).

Некаторыя апытаныя распавядалі, што задумваюцца пра вымушаную эміграцыю з-за страху за бяспеку сваю і сваёй сям'і. Частка пацярпелых на момант апытанняў ужо знаходзілася за межамі краіны.

## Сексуальны гвалт

Асобна можна вылучыць выпадкі сексуальнага гвалту. Жанчыны распавядалі, што ў іх бок гучалі намёкі, абразы («прастытутка» і падобнае) і прыніжэнні, якія мелі сексуальны падтэкст. Яны адзначалі, што «стаўленне да нас было непрымальнае і непаважлівае менавіта таму, што ты жанчына» (**Сведка ДД., Сведка Е., Сведка Т.**). Да дзяўчат прыставалі су-

працоўнікі міліцыі: «Ён мяне спачатку прыабняў, потым груба пачапаў за шыю», «ён пачаў мяне гладзіць па вуснах, твары, валасах і прыціскаць да сябе» (**Сведка ДД., Сведка Е.**). Такія паводзіны з боку супрацоўнікаў жанчыны расцэньвалі як рэальную пагрозу. У дачыненні да мужчын таксама неаднойчы практыкаваліся пагрозы сексуальным гвалтам - «мы будзем цябе трахаць дубінкамі» - пасля чаго звычайна ішло збіццё. (**Сведка ФФ., Сведка ЖВ.**) Для большага запалохвання супрацоўнікі маглі распранаць як жанчын, так і мужчын. (**Сведка О., Сведка Е., Сведка ЖВ**.)

# СЛУЖБОВЫЯ АСОБЫ ФРУНЗЕНСКАГА РУУС Г. МІНСКА, МЕРКАВАНА ДАТЫЧНЫЯ ДА ЗДЗЯЙСНЕННЯ ЗЛАЧЫННЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Маштаб гвалту, катаванняў, якія адбываліся 9-13 жніўня 2020 года і ў наступны час, не меў аналагаў у гісторыі Беларусі. Усталявана і адлюстравана ў розных даследаваннях (гл. Чацвёртую прамежкавую справаздачу Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі: Умовы ўтрымання ў месцах несвабоды са жніўня 2020 па травень 2021 года[1]), што такія дзеянні былі санкцыянаваныя і ўхваленыя ў загадах вышэйшых службовых асобаў, пачынаючы з асобы, якая займае пасаду прэзідэнта. Да цяперашняга часу[2] ніводзін супрацоўнік сілавых установаў не быў прыцягнуты да адказнасці за масавыя катаванні.

Апісаныя факты масавага жорсткага гвалту, катаванняў у Фрунзенскім РУУС г. Мінска ў перыяд 9-13 жніўня 2020 г. у дачыненні да затрыманых асобаў, прычым абгрунтаванасць іх затрыманняў не правяралася, былі беспрэцэдэнтныя. Неабходна адзначыць, што гвалт быў нічым не справакаваны, прымяняўся ў дачыненні да знерухомленых асобаў, як правіла, якія ляжалі ці сядзелі на падлозе, рукі якіх былі ў кайданках або сцяжках. Падобныя дзеянні здзяйсняліся ва ўсіх аддзяленнях міліцыі г. Мінска. Аднак па ступені жорсткасці і вычварэння гэты аддзел міліцыі перавысіў усе іншыя аддзелы.

Затрыманні і дастаўленне грамадзянаў у Фрунзенскі РУУС, як правіла, ажыццяўлялі супрацоўнікі АМАП, апранутыя ў чорную форму. Апытаныя

1 https://drive.google.com/file/d/1BdRF2t5umJl7JTD9mT7RaxPmeJdMJpbi/view
2 На дату напісання дакумента. 17.05.2022 года.

асобы ў некаторых выпадках распавядалі пра асобаў у грамадзянскім адзенні ў балаклавах, у аліўкавай форме. Іх удзел у збіцці грамадзянаў адзначаўся ў перыяд выгрузкі (прагон затрыманых праз «жывы калідор» з нанясеннем удараў дубінкамі) і падчас дастаткова непрацяглай прысутнасці ў самім аддзяленні, калі яны таксама збівалі затрыманых, адмаўлялі ў меддапамозе. Канкрэтных прыкметаў дадзеных асобаў апытаныя не называюць, паколькі практычна ўсе АМАПаўцы былі ў балаклавах. Асноўны час у спартовай зале і іншых памяшканнях Фрунзенскага РУУС г. Мінска знаходзіліся і дзейнічалі непасрэдна супрацоўнікі міліцыі. Большая частка іх была не ў форме, у масках, што ўскладняе іх ідэнтыфікацыю. Затрыманыя часцей за ўсё давалі толькі кароткае апісанне адзення і некаторых характэрных рысаў асобы. Ніжэй прыведзеныя тлумачэнні ў той форме і аб'ёме, у якіх затрыманыя 9-13.08.2020 г. змаглі апісаць асобаў, якія здзяйснялі гвалт.

У адносінах да дадзенага расследавання лічым неабходным назваць вышэйшых **службовых асобаў, адказных за парушэнне законнасці ў памяшканні Фрунзенскага РУУС г. Мінска і непрыцягненне вінаватых да адказнасці.**

1. Асоба, якая займае пасаду прэзідэнта, **Лукашэнка Аляксандр Рыгоравіч**

2. Былы міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь **Караеў Юры Хаджымуратавіч**

3. Былы намеснік міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь **Барсукоў Аляксандр Пятровіч**

4. Былы начальнік Галоўнай управы ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама **Кубракоў Іван Уладзіміравіч** (на дадзены момант міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь)

5. Камандзір АМАП ГУУС Мінгарвыканкама **Балаба Дзмітры Уладзіміравіч**

6. Былы Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь **Канюк Аляксандр Уладзіміравіч**

7. Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь **Швед Андрэй Іванавіч**

8. Пракурор горада Мінска **Лаўрухін Алег Уладзіміравіч**

9. Начальнік Фрунзенскага РУУС г. Мінска **Палулех Аляксандр Уладзіміравіч**

Адназначна ўсталявана, па сутнасці, гэта не адмаўлялася афіцыйна, што загады на прымяненне жорсткага абыходжання і гвалту аддаваліся, прымаліся да выканання і даводзіліся да падначаленых менавіта імі.

**Асобы, якія меркавана прымалі непасрэдны ўдзел у жорсткім абыходжанні і катаваннях,** апазнаныя сведкамі, якія ўтрымліваліся ў Фрунзенскім РУУС г. Мінска з 9 да 13 жніўня 2020 года[3].

Са сведчанняў апытаных Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі грамадзянаў мы можам адзначыць наступных службовых асобаў і іх датычнасць да катаванняў затрыманых на тэрыторыі і ў памяшканнях Фрунзенскага РУУС г. Мінска з 09.08.2020 да 13.08.2020 года.

3 Фотаздымкі і імёны сілавікоў былі атрыманыя дзякуючы Чорнай кнізе Беларусі https://telegra.ph/Frunzenskoe-RUVD-09-23

№ 001



ПІБ

**Палулех Аляксандр Уладзіміравіч**

25.06.1979 года нараджэння

пасада, званне

Начальнік Фрунзенскага РУУС горада Мінска, палкоўнік міліцыі

Датычнасць да катаванняў

Як кіраўнік установы адказны за тое, што адбывалася на яе тэрыторыі. Аддаваў загады на збіццё затрыманых. Не рабіў ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў. Непасрэдна ўдзельнічаў у катаваннях затрыманых.

> *"Гэты чалавек знаходзіўся ў ноч з 10-га на 11-га ў РУУС, збіваў затрыманых, непасрэдна ў дачыненні да мяне яго дзеянні заключаліся ў тым, што нейкія супрацоўнікі мяне са спартзалы адвялі ў асобны пакой, мне здаецца, гэта нешта кшталту распраналкі, куды зайшоў Палулех Аляксандр Уладзіміравіч і абсалютна нематывавана збіў мяне гумовай дубінкай міліцэйскай, пры гэтым пагражаючы, абражаючы. Гэта была проста такая акцыя запалохвання. Ён жа збіваў і тых, з кім непасрэдна я быў затрыманы".*

## № 002



**ПІБ**

## Дзенісеня
## Аляксандр Мікалаевіч

13.02.1984 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Намеснік начальніка ААПП Фрунзенскага РУУС, маёр міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Знаходзіўся ў спартзале РУУС, у яго прысутнасці, з яго маўклівай згоды здзяйсняліся катаванні.

## № 003



**ПІБ**

**Захвіцэвіч**
**Аляксандр Аляксандравіч**

01.01.1977 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Намеснік начальніка Фрунзенскага РУУС, палкоўнік міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Знаходзіўся ў спартзале РУУС, у яго прысутнасці, з яго маўклівай згоды здзяйсняліся катаванні.

## № 004



**ПІБ**

**Аўсеенка**
**Максім Сяргеевіч**

16.01.1990 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Фрунзенскага РУУС, старэйшы лейтэнант міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Цісную на пацярпелую, патрабуючы падпісаць пратакол аб затрыманні.

*"Гэты чалавек пагражаў, павышаў голас, казаў, што, калі б я была мужчынам, я была б ужо без зубоў, усяляк ціснуў псіхалагічна, каб быў падпісаны пратакол".*

## № 005



**ПІБ**

## Валуйская
## Карына Яўгенаўна

03.11.1993 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Міліцыянтка роты патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі Фрунзенскага РУУС

**Датычнасць да катаванняў**

Апазнаная вялікай колькасцю пацярпелых. Паводзіла сябе вельмі агрэсіўна. Ёй здзяйсняліся масавыя катаванні і іншыя супрацьпраўныя дзеянні, яна збівала затрыманых, у тым ліку і дзяўчат, пагражала, абражала, усяляк ціснула на затрыманых людзей.

> *"Аднаго хлопца паставілі на тумбу, надзелі каску, і Карына Валуйская, супрацоўніца міліцыі, пачала яго збіваць сталёвай бітай па галаве. Каска была пластыковая, а біта сталёвая. Ён падаў, яго за каўнер падымаюць, ставяць, зноў пачынаюць біць."*

> *"Яна засунула мне ў кішэню джынсаў і байкі курыныя яйкі і нанесла ўдары ў той жа вобласці, яны разбіліся, нанесла пару аплявух, абражала, псіхалагічна ціснула".*

> *"Былі такія выпадкі, пакуль мы стаялі ў позе на каленях, рукі за спінай, у кагосьці званілі тэлефоны, будзільнікі ўжо зранку. У многіх, калі тэлефон выключаны, ці сеў, ён усё адно ўключаецца, калі працуе будзільнік. І на маіх вачах два тэлефоны проста зляцелі і зламаліся ўшчэнт, з рук Карыны. Яна проста падыходзіць, бярэ тэлефон затрыманага, або разбівае яго аб падлогу, або кідае далёка, і таксама ён разбіваецца. Яна па яго вярталася, па гэты тэлефон, біла яго дубінкай, некалькі тэлефонаў такіх было. На маёй памяці, прыладаў 5, дакладна з яе рук сышло. ... я чуў гісторыі, што хлопцаў яна біла па геніталіях, можа кудысьці адводзіла і біла па геніталіях".*

> *"... яна адводзіла людзей у памяшканне, тыпу душ, пліткай усё выкладзена, і намякала на тое, што будзе нейкія працэдуры з вадой праводзіць. Там такі дыялог быў, што казалі, нешта паліваць вадой, ці што. Яна дакладна там была, таму што гэта адзіная жанчына ў той дзень, 11 жніўня, якая біла людзей, і па голасе было зразумела, што гэта яна".*

> *"...Яна прыйшла зранку. Біла і тых, хто ляжаў на падлозе, і новых людзей, якіх прывялі ўжо бліжэй да раніцы, ці зранку... Яна іх біла, каб яны падпісвалі пратакол. Прама ля сцяны, іх нават нікуды не адводзілі. Я яе бачыла, калі яна падымала людзей і з імі размаўляла".*

## № 006



**ПІБ**

## Хвайніцкі Андрэй Андрэевіч,

27.08.1999 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Участковы інспектар міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Фрунзенскага РУУС, лейтэнант міліцыі.

**Датычнасць да катаванняў**

Гэты чалавек знаходзіўся ў спартзале, быў сведкам усіх катаванняў. Ім не рабілася ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў з боку іншых сілавікоў.

> *"Ён мне ў нейкі момант дапамог. Адкачаў, калі я губляў прытомнасць, нашатырам і прынёс вады. І яшчэ, па-мойму, адвёў у прыбіральню. Адзіны чалавек, які нічога не рабіў. Прынамсі да мяне... і ў той вечар я не бачыў, каб ён нешта рабіў у дачыненні да каго-небудзь".*

**№ 007**



**ПІБ**

**Дзяшко**
**Сяргей Іванавіч**

27.07.1994 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Участковы інспектар міліцыі ААПП МГБ Фрунзенскага РУУС, старэйшы лейтэнант міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Праводзіў вопіс рэчаў затрыманых зранку 11-га жніўня. Збіваў затрыманых, ствараў умовы жорсткага ўтрымання затрыманых (ненаданне медыцынскай дапамогі, ненаданне вады, адмаўляў у магчымасці наведвання прыбіральні).

*"Я непасрэдна бачыў яго перад сабой без маскі. У яго дастаткова запамінальная знешнасць, густыя бровы, мноства радзімак, вушы характэрнай формы. Каля 8 раніцы гэты чалавек надзеў балаклаву на галаву і паставіў усіх, хто знаходзіўся ў спартзале па перыметры ў надзвычай нязручную позу, а менавіта - на каленях, з рукамі за спінай, у кагосьці ў кайданках, у кагосьці рукі сцягнутыя хамутамі, у кагосьці без кайданкоў, але тым не менш, рукі трэба было трымаць за спінай, на каленях, упёршыся галавой у падлогу і сцяну. Гэта надзвычай нязручная поза, тых, хто адмаўляўся гэта рабіць, або, па яго меркаванні, рабіў гэта занадта марудна, ён збіваў. Ён наносіў удары дубінкай гэтым людзям, некалькі такіх эпізодаў, я ўсё гэта чуў - характэрныя гукі ўдараў, адразу пасля гэтага крыкі ці стогны людзей, некалькі з гэтых эпізодаў я бачыў асабіста. Адзін з затрыманых не мог знаходзіцца ў такім становішчы, яго шмат разоў збівалі. Дзяшко Сяргей наносіў удары абсалютна нематываванна гэтаму затрыманаму чалавеку. Гэты ж Дзяшко Сяргей адмаўляў людзям у медыцынскай дапамозе, хаця яны яго пра гэта прасілі, збіваў людзей за просьбы схадзіць у прыбіральню, за просьбы даць папіць вады".*

## № 008



ПІБ

**Жылянкова**
**Ліліяна Генадзеўна**

11.04.1996 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Старэйшая інспектарка ГІГС. Афіцыйная прадстаўніца Партазанскага РУУС г. Мінска

**Датычнасць да катаванняў**

Была на тэрыторыі Фрунзенскага РУУС, з'яўляецца сведкай катаванняў затрыманых, заахвочвала катаванні. Ёй не рабілася ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў з боку іншых сілавікоў.

*"... яна хадзіла з тэлефонам, гучна смяялася і здымала ўсё, што адбывалася вакол. Я так зразумеў, з відэа катаванняў, якое там было, некалькі кадраў дакладна былі з яе тэлефона ... з тэлефона, якім яна здымала".*

## № 009



ПІБ

**Навіцкі**
**Віктар Браніслававіч**

28.12.1973 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Старэйшы інспектар па дазваленчай працы ААПП МГБ Фрунзенскага РУУС, маёр міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Складаў пратаколы затрыманняў. Гэты чалавек знаходзіўся ў спартзале, быў сведкам усіх катаванняў. Ім не рабілася ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў з боку іншых сілавікоў.

*"Ён сядзеў за сталом у той момант, калі мяне паклікалі да стала і далі падпісваць нейкія паперкі, не чытаючы іх. Яго я дакладна пазнаў".*

## № 010



ПІБ

**Бірчанка**
**Аляксандр Мікалаевіч**

09.10.1976 **года нараджэння**

**пасада, званне**

Намеснік начальніка аддзела крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі Фрунзенскага РУУС, падпалкоўнік міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Складаў пратаколы затрымання. Гэты чалавек знаходзіўся ў спартзале, быў сведкам усіх катаванняў. Ім не рабілася ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў з боку іншых сілавікоў.

*"Наступнага, каго я бачыў, хутчэй за ўсё Бірчанку, ён у мяне, да таго, як мяне паклікалі да стала і пакуль мы ляжалі ўсе тварам у падлогу, ён падымаў мяне і глядзеў мой тэлефон трэці раз".*

**№ 011**



ПІБ

**Міхайлоўскі**
**Яўген Віктаравіч**

30.08.1987 года нараджэння

пасада, званне

Участковы інспектар міліцыі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Фрунзенскага РУУС, капітан міліцыі

**Датычнасць да катаванняў**

Складаў пратаколы затрыманняў. Гэты чалавек знаходзіўся ў спартзале, быў сведкам усіх катаванняў. Ім не рабілася ніякіх дзеянняў для спынення катаванняў з боку іншых сілавікоў.

*"Ён у асноўным сядзеў за сталом і толькі рабіў пратаколы ўсіх людзей. Я не памятаю, ці рабіў ён на мяне. Па-мойму, не. Скажам так, актыўных супрацьдзеянняў не праяўляў, але шчыра кіраваўся загадамі, складаючы пратаколы".*

## КВАЛІФІКАЦЫЯ ДЗЕЯННЯЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ ФРУНЗЕНСКАГА РУУС Г. МІНСКА І КАРАЛЬНАСЦЬ

Пералічаныя вышэй масавыя сістэматычныя гвалтоўныя дзеянні ўладаў у дачыненні да затрыманых грамадзянаў з'яўляюцца злачыннымі як па ўнутраным, так і па міжнародным праве.

Яны цалкам ахопліваюцца складам злачынства, прадугледжанага **артыкулам 128 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь** (злачынствы супраць бяспекі чалавецтва), згодна з якім катаванні ці акты жорсткасці, якія здзяйсняюцца ў сувязі з палітычнымі перакананнямі грамадзянскага насельніцтва, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў, ці пажыццёвым пазбаўленнем волі, ці смяротным пакараннем.

З пункту гледжання міжнароднага крымінальнага права, выкладзеныя акты гвалту цалкам трапляюць і пад юрысдыкцыю Міжнароднага крымінальнага суда і, згодна з падпунктамі f) і k) пункта 1 артыкула 7 Рымскага статута, **кваліфікуюцца як катаванні і іншыя бесчалавечныя дзеянні аналагічнага характару, якія заключаюцца ў наўмысным прычыненні моцных пакутаў ці сур'ёзных цялесных пашкоджанняў ці сур'ёзнай шкоды псіхічнаму ці фізічнаму здароўю.**

Што ж тычыцца службовых асобаў - прадстаўнікоў улады, якія прысутнічалі пры здзяйсненні катаванняў і актаў жорсткасці іншымі асобамі, але

не зрабілі мераў па спыненні гэтых злачынстваў, іх дзеянні могуць быць кваліфікаваныя па частцы 2 артыкула 425 Крымінальнага кодэкса (бяздзейнасць службовай асобы) як наўмыснае насуперак інтарэсам службы невыкананне службовай асобай дзеянняў, якія яна павінна была і магла здзейсніць у сілу ўскладзеных на яе службовых абавязкаў, звязанае з патураннем злачынству, што пацягнула цяжкія наступствы.

Усталяваная законам мера адказнасці за падобнае патуранне - пазбаўленне волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

Аднак рэалізацыя крымінальнай адказнасці асобаў, вінаватых у здзяйсненні злачынства супраць чалавечнасці, у межах існуючага ў Беларусі палітычнага рэжыму ў цяперашні час практычна немагчымая, бо малаверагодна, што яна будзе здзейсненая тымі ж асобамі, якія і з'яўляюцца вінаватымі ў здзяйсненні гэтых злачынстваў.

Практычна невыканальнае і адданне вінаватых Міжнароднаму крымінальнаму суду.

Як вядома, Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца ўдзельніцай Рымскага Статута, такім чынам, звярнуцца да пракурора Міжнароднага крымінальнага суда з заявай пра завядзенне справы па падзеях 2020 г. у Беларусі пэўна можа толькі Рада Бяспекі ААН.

Аднак, датычна дадзенага канкрэтнага выпадку, наўрад ці Расія, якая валодае правам вета ў Радзе Бяспекі ААН, дасць згоду на такую заяву.

Найбольш перспектыўным у гэтым сэнсе з практычнага пункту гледжання з'яўляецца выкарыстанне так званага **механізма ўніверсальнай юрысдыкцыі.**

Узгаданы механізм азначае, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці за злачынствы, якія кваліфікуюцца ў Беларусі па арт. 128 КК РБ, не толькі на тэрыторыі нашай дзяржавы, але і ў любой іншай краіне-ўдзельніцы міжнародных канвенцый аб барацьбе з міжнароднымі злачынствамі.

Крымінальны працэс у парадку ўніверсальнай юрысдыкцыі ўжо пачаты ў Літве, падрыхтоўчая праца вядзецца ў Германіі, Польшчы і Чэхіі.




© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2022